ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 35 (484) | Субота, 28 лістапада 1981 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

**У Мінску 24 лістапада адбыўся IV пленум Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі. Абмеркаваны вынікі лістападаўскага (1981 г.) Пленума ЦК КПСС і задачы партыйных арганізацый рэспублікі, выходзячыя з рашэнняў Пленума і прамовы на ім Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева.**

**З дакладам выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі таварыш Ц. Я. Кісялёў.**

**Пленум заслухаў даклады першага намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР, Старшыні Дзяржплана БССР тав. В. А. Гвоздзева «Аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларускай ССР на 1981—1985 гады і аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця БССР на 1982 год» і міністра фінансаў БССР тав. Б. І. Шапілы «Аб Дзяржаўным бюджэце Беларускай ССР на 1982 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту БССР за 1980 год».**

**Па абмеркаваных пытаннях пленум ЦК КПБ прыняў пастанову, якая апублікавана ў друку.**

## Сесія Вярхоўнага Савета БССР

25—26 лістапада ў Мінску праходзіла чацвёртая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР дзесятага склікання.

На сесіі былі разгледжаны пытанні:

1. Аб выбранні члена Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. (Пытанне ўнесена Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР).

2. Аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларускай ССР на 1981—1985 гады.

3. Аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларускай ССР на 1982 год і аб ходзе выканання Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларускай ССР у 1981 годзе.

4. Аб Дзяржаўным бюджэце Беларускай ССР на 1982 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР за 1980 год.

5. Аб праектах Закона Беларускай ССР «Аб ахове атмасфернага паветра» і Закона Беларускай ССР «Аб ахове і выкарыстанні жывёльнага свету». (Пытанні ўнесены Саветам Міністраў Беларускай ССР).

6. Аб праектах Закона Беларускай ССР «Аб судовым ладзе Беларускай ССР», Закона Беларускай ССР «Аб выбарах раённых (гарадскіх) народных судоў Беларускай ССР», Закона Беларускай ССР «Аб парадку адклікання народных суддзяў і народных засядацеляў раённых (гарадскіх) народных судоў Беларускай ССР» і аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. (Пытанне ўнесена Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР).

Вярхоўны Савет аднагалосна выбраў дэпутата Ц. Я. Кісялёва членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

З дакладам аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларускай ССР на 1981—1985 гады, аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларускай ССР на 1982 год і аб ходзе выканання Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларускай ССР у 1981 годзе выступіў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, Старшыня Дзяржплана рэспублікі дэпутат В. А. Гвоздзеў.

З дакладам аб Дзяржаўным бюджэце Беларускай ССР на 1982 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР за 1980 год выступіў міністр фінансаў БССР дэпутат Б. І. Шапіла.

Садаклад пастаянных камісій Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па гэтых пытаннях зрабіў старшыня планава-бюджэтнай камісіі Вярхоўнага Савета БССР дэпутат В. Д. Бысенка.

(БЕЛТА).

## ЗА ВЫДАТНУЮ ВУЧОБУ — З ПЕРШАГА КУРСА

Напярэдадні VII агульнауніверсі т э цкай справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі ў групе Г-11 гісторыка-філалагічнага факультэта адбыўся камсамольскі сход: «За выдатную вучобу — з першага курса». Асноўнымі на парадку яго дня былі пытанні паспяховасці.

Выступаючыя на сходзе гаварылі аб рашэннях XXVI з'езда КПСС, накіраваных на развіццё вышэйшай адукацыі і падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў у краіне, падкрэслівалі, што кожны студэнт, пачынаючы з 1-га курса, павінен адказваць на іх выдатнай вучобай, актыўным удзелам у навукова-даследчай рабоце, грамадскім жыцці.

Камсамольцы групы вызначылі планы на будучае. Нягледзячы на тое, што з пачатку навучальнага года прайшло не так многа часу, у групе ўжо ёсць перадавікі вучобы — Таццяна Даўгун і Валерый Кацуба.

На сходзе быў абмеркаваны і падтрыманы зварот студэнтаў групы Г-41 гістфіла да ўсіх камсамольцаў універсітэта, прыняты сацыялістычныя абавязацельствы групы на бягучы навучальны год.

**Т. МАСЛЮКОЎ,**
**студэнт 1-га курса гістфіла.**

## САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

### ГРУПЫ Г-11 ГІСТОРЫКА-ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

**Натхнёныя рашэннямі XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, імкнучыся дастойна сустрэць XIX з'езд ВЛКСМ, студэнты групы Г-11 гісторыка-філалагічнага факультэта прымаюць наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:**

— дастойна завяршыць першы семестр і бягучы навучальны год у цэлым, паспяхова авалодваць абранай спецыяльнасцю, выдатнай вучобай, ударнай працай і актыўнай грамадскай дзейнасцю з першага курса памнажаць славу Гомельскага дзяржаўнага універсітэта;

— пастаянна дабівацца павышэння паспяховасці, актыўнага ўдзелу кожнага студэнта ў семінарах, калёквіумах.

— паспяхова здаць зімовую сесію, дамагацца 100 % паспяховасці;

— прыняць актыўны ўдзел у студэнцкім будаўнічым руху універсітэта, добрасумленна працаваць на суботніках і нядзельніках;

— актыўна ўдзельнічаць у рабоце народнага універсітэта па ахове помнікаў гісторыі і культуры, у рабоце ДНД, шэфстваваць над СШ № 26;

— рэгулярна праводзіць палітінфармацыі, з глыбокім веданнем абмяркоўваць падзеі ў свеце, важнейшыя моманты ўнутранай і знешняй палітыкі КПСС і савецкай дзяржавы, правесці ў групе тэматычнае абмеркаванне кнігі Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжнева «Успаміны».

* * *

Студэнты групы Г-11 падтрымалі зварот групы Г-41 да ўсіх камсамольцаў універсітэта і заклікаюць першакурснікаў прыняць сацыялістычныя абавязацельствы па дастойнай сустрэчы вышэйшых камсамольскіх форумаў рэспублікі і краіны.

Студэнты групы выклікаюць на сацыялістычнае спаборніцтва групы Р-11 і БР-11.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ АБМЕРКАВАНЫ І ПРЫНЯТЫ НА СХОДЗЕ ГРУПЫ Г-11.

## СЛОВА, ЯКОЕ КЛІЧА НА ПОДЗВІГ І ПРАЦУ

**САКРАТАРЫЯТ ЦК ВЛКСМ ПРЫНЯЎ ПАСТАНОВУ АБ РАБОЦЕ КАМІТЭТАЎ КАМСАМОЛА Ў СУВЯЗІ З АПУБЛІКАВАННЕМ КНІГІ ГЕНЕРАЛЬНАГА САКРАТАРА ЦК КПСС, СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР ТАВАРЫША Л. І. БРЭЖНЕВА «УСПАМІНЫ».**

З велізарным натхненнем, глыбокай увагай і зацікаўленасцю, гаворыцца ў пастанове, успрынялі камсамольцы, юнакі і дзяўчаты нашай краіны «Успаміны» таварыша Л. І. Брэжнева, якія ўсебакова раскрываюць тэму сапраўднай народнасці, ленінскай партыйнасці ў рабоце камуністаў, адданасці Айчыне, партыі, творчага стварэння, любві да людзей, барацьбы за мір, грамадзянскай самасвядомасці падрастаючага пакалення. У новым творы таварыша Л. І. Брэжнева на яркіх гістарычных матэрыялах раскazваецца аб вытоках і прынцыпах камуністычнай маралі, рабочай маралі, глыбокай унутранай культуры працоўнага народа, сапраўды гуманістычных сацыяльных асноў нашага ладу. Паказана вялікая высакародная сіла творчай, стваральнай працы, вялікае значэнне традыцый рабочага класа ў выхаванні ў маладых людзей характару, сацыяльнай актыўнасці, шырыні мыслення, кемлівасці, фарміраванні ўнутранай патрэбы выканаць справу якасна, на высокім прафесіянальным узроўні, пачуццяў калектывізму, супольнасці інтарэсаў, пралетарскай салідарнасці.

Працы таварыша Л. І. Брэжнева, яго выдатныя кнігі «Успаміны», «Малая зямля», «Адраджэнне» і «Цаліна» — сапраўдны падручнік жыцця для ўсёй савецкай моладзі, дакумент вялікай мабілізуючай сілы, натхняючы прыклад самаадданага служэння Радзіме, партыі, народу, справе міру і сацыялізму.

Надаючы выключна важнае значэнне новай кнізе таварыша Л. І. Брэжнева ў выхаванні маладога пакалення, падкрэсліваецца ў пастанове, камітэтам камсамола неабходна арганізаваць у вытворчых калектывах, вучэбных групах, класах, маладзёжных інтэрнатах, клубах і палацах культуры, бібліятэках чытанне, праслухоўванне, глыбокае вывучэнне камсамольцамі, усімі юнакамі і дзяўчатамі «Успамінаў» таварыша Л. І. Брэжнева, правесці тэматычныя гутаркі, канферэнцыі чытачоў, выпускі вусных часопісаў.

**Камсамольскія арганізацыі закліканы забяспечыць шырокую прапаганду гераічнай гісторыі КПСС, вопыту партыі і народа ў барацьбе за пабудову сацыялізму і камунізму, умацаванне магутнасці нашай Радзімы, міралюбівай знешняй палітыкі Савецкай дзяржавы, шматграннную дзейнасць Цэнтральнага Камітэта КПСС, Палітбюро ЦК КПСС на чале з выдатным партыйным і дзяржаўным дзеячам сучаснасці, мудрым, патрабавальным і клапатлівым настаўнікам моладзі таварышам Л. І. Брэжневым.**

Трэба дабівацца, каб усе юнакі і дзяўчаты разумелі ролю і веліч чалавека працы, гістарычную місію пралетарыяту. Выхоўваць маладых працаўнікоў на слаўных гераічных традыцыях рабочага класа і калгаснага сялянства, праслаўленых вытворчых калектываў, у духу сацыялістычнага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, адданасці ідэалам камунізму.

Развіваць у моладзі гатоўнасць да подзвігу, уменне бачыць гераіку ў працоўных буднях сённяшняга дня. Весці мэтанакіраваную агітацыйна-прапагандысцкую работу сярод моладзі ў цеснай сувязі з практычнымі справамі камсамольцаў, з іх жыццём. Змагацца з праяўленнямі палітычнай наіўнасці, даваць рашучы адпор варожай ідэалогіі і маралі.

У ходзе падрыхтоўкі да XIX з'езда ВЛКСМ, справаздач і выбараў, правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!», з улікам высокіх патрабаванняў, грамадзянскага пафасу кнігі таварыша Л. І. Брэжнева «Успаміны» неабходна крытычна прааналізаваць дзейнасць камітэтаў па класавай, працоўнай, маральнай загартоўцы юнакоў і дзяўчат, удасканаленню стылю і метадаў выхаваўчай работы. Дабівацца стварэння жывой і творчай атмасферы ў кожнай камсамольскай арганізацыі.

Абавязак камсамольскіх работнікаў, актывістаў прыняць асабісты ўдзел у прапагандзе новай кнігі Л. І. Брэжнева.

## ГУТАРКА ЗА «КРУГЛЫМ СТАЛОМ»

Для студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце № 2, нядаўна была наладжана сустрэча з выкладчыкамі кафедры навуковага камунізму. Да іх прыйшлі в. а. загадчыка кафедры У. І. Качаткоў, І. Б. Кудравіцкі, М. І. Коўзік, Н. М. Канашэвіч, У. В. Кананкоў. У гутарцы былі ўзняты і асветлены актуальныя пытанні сучаснага жыцця нашай краіны, знешняй палітыкі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.

Ісак Барысавіч Кудравіцкі ў сваім выступленні асаблівую ўвагу ўдзяліў апошнім падзеям, якія ўсхвалявалі ўвесь савецкі народ, — Пленуму ЦК КПСС, што адбыўся 16 лістапада, і шостай сесіі Вярхоўнага Савета СССР. На іх былі разгледжаны асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі, навукі, культуры. Кіруючыся палажэннямі і вывадамі, выказаннямі ў прамове на Пленуме Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева, неабходна павысіць эфектыўнасць народнай гаспадаркі, максімальна выкарыстоўваць усе магчымасці для паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу. Неабходна дабівацца больш эфектыўных вынікаў у дзейнасці навукова-даследчых, праектных і канструктарскіх арганізацый, настойліва праводзіць работу па далейшаму паляпшэнню планавання і кіравання эканомікай, удасканаленню стылю і метадаў гаспадарання.

М. І. Коўзік асвятліў падзеі ў Польшчы: прааналізаваў прычыны крызіснай сітуацыі, пазіцыю Савецкага Саюза ў сувязі з гэтымі падзеямі.

Выступленні выкладчыкаў перамяжаліся пытаннямі. Прысутных цікавілі і вытокі ідэалагічных дыверсій супраць Кубы, краін басейна Карыбскага мора — Сальвадора, Нікарагуа, і праблемы развіцця эканомікі нашай краіны, і апошнія падзеі на граніцы паміж Іранам і Іракам, і шмат іншых.

Карыснасць такіх сустрэч відавочная. Гэта адна з форм ідэалагічнага выхавання і асветы студэнтаў. У простай, шчырай атмасферы хутка наладзілася гутарка. Агульнае пажаданне ўсіх студэнтаў гэтай сустрэчы, каб яны паўтараліся часцей. Тады яны ахопяць большую аўдыторыю, павялічыць актыўнасць, зацікаўленасць.

**Ала ЦЫМБАЛ,**
**студэнтка другога курса матэматычнага факультэта.**

*Ветэраны — моладзі*

# У СПАДЧЫНУ СЫНАМ

Першакурснікі фізічнага факультэта нядаўна прымалі ў сябе жаданых гасцей — ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Аляксея Аляксеевіча Баскакава, Рыгора Сямёнавіча Мільчанку, Аляксея Аляксеевіча Косцікава. Стаіўшы дыханне, слухалі юнакі і дзяўчаты такія простыя і сціплыя расказы аб франтавым жыцці ветэранаў. Але за гэтай сціпласцю адчуваецца вялікая сіла волі, здольнасць кожнага ва ўмовах небяспекі, якая навісла тады над нашай Айчынай, аддаць жыццё за яе незалежнасць.

Р. С. Мільчанка, А. А. Баскакаў і А. А. Косцікаў прынеслі на вечар сустрэчы фатаграфіі ваеннага часу. І трэба было бачыць з якой увагай разглядвала іх прысутная моладзь, загараліся вочы! А калі Аляксей Аляксеевіч Баскакаў пачаў успамінаць найбольш памятныя выпадкі сваёй ваеннай біяграфіі, аўдыторыя ператварылася ў суцэльны слых. Я не перабольшваю, таму што перад сучаснай моладдзю, якая аб вайне ведае толькі з кніг і кіно, як жывыя, паўставалі вобразы тых далёкіх палымяных гадоў.

Вось адзін з такіх эпізодаў. А. А. Баскакаў на фронце служыў у лётных вайсках. Неяк яму і вядучаму іх звяна камандаванне арміі дало заданне сфатаграфаваць мясцовасць, на якой замацаваліся фашысты. На двух знішчальніках лётчыкі вылецелі на заданне. Яно было паспяхова выканана, і знішчальнікі ўзялі курс на свой аэрадром. Раптам паказаліся «фокеры». Іх было шаснаццаць, і дапамогі чакаць няма адкуль. Лётчыкі вырашылі прыняць бой. Вядучы быў збіты. І ведамы самалёт атрымаў сур'ёзныя пашкоджанні, але да сваіх неяк дацягнуў. А там, за лініяй фронту, самалёт упаў прама на артылерыйскую батарэю. Параненага лётчыка артылерысты выцягнулі з-пад абломкаў палаючага самалёта і адправілі ў медсанбат. Фотаплёнкі ў цэласці былі дастаўлены ў штаб арміі.

**Ігар БАНАДЫСЕЎ,**
**адказны за работу ваенна-патрыятычнага сектара камсамольскага бюро фізфака.**

*«КП» — У ДЗЕЯННІ*

# ПАД ЯРКІ ПРОМЕНЬ

Камсамольскі пражэктар» — дзейсны орган камсамольскай арганізацыі універсітэта. Асноўную увагу пражэктарысты ўдзяляюць паспяховасці студэнтаў. Рэгулярна праводзяцца агульнауніверсітэцкія праверкі стану паспяховасці. У гэтым актыўна дапамагае штабу «КП» пастаянны кантакт з вучэбна-выхаваўчымі камісіямі факультэтаў. Зразумела, што паспяховасць у першую чаргу залежыць ад наведвання заняткаў студэнтамі. Таму члены штаба «КП» праводзяць і рэйды па праверцы наведвання заняткаў. Так, у мінулым навучальным годзе праведзена 46 такіх рэйдаў.

У цесным кантакце працуе штаб «КП» з народным кантролем універсітэта і факультэтаў. Пад пільным вокам пражэктара аказалася работа студэнцкай сталовай № 40 і буфетаў у вучэбных карпусах і інтэрнатах. Вынікі праверак былі не зусім суцяшальныя: выяўлена шмат недахопаў. Гэта знаходзіла належнае адлюстраванне на старонках «КП».

Штаб «Камсамольскага пражэктара» не пакінуў без увагі і быт студэнтаў. За мінулы навучальны год праведзена 37 рэйдаў па праверцы быту і санітарнага стану студэнцкіх інтэрнатаў. Многія недахопы, выяўленыя ў ходзе праверак, як высветлілася, могуць ліквідаваць самі студэнты, не чакаючы дапамогі ад каменданта ці студсавета. Замяніць, напрыклад, праводку, разетку, адрамантаваць паламаную мэблю і інш. Варта толькі зрабіць адпаведны запіс у журнале.

Правяраецца пражэктарыстамі і правільнасць афармлення камсамольскай дакументацыі. Гэта дазваляе выявіць такіх камсоргаў, якія неахайна афармляюць неабходную дакументацыю, не выконваюць мерапрыемствы, уключаныя ў план работы, хаця ў справаздачах яны лічацца як праведзеныя.

У апошні час у планах работы «Камсамольскага пражэктара» з'явіўся новы рэйд — па эканоміі электраэнергіі, санітарнага стану аўдыторый.

Словам, пад яркі промень камсамольскага пражэктара трапляюць усе негатыўныя з'явы ў студэнцкім жыцці. Дасціпнае слова, сатырычны малюнак бяруць на свае «узбраенне» пражэктарысты, каб не было месца недахопам.

**М. КРАЎЦОЎ.**

# ПЯСНЯР СВАЙГО НАРОДА

Вядомаму беларускаму паэту і крытыку Анатолю Вярцінскаму споўнілася 50 гадоў. Многа гэта ці мала для жыцця? Безумоўна, мала. Якраз у гэтыя гады да аўтара, як кажуць, прыходзіць другое дыханне. Перад ім адкрыліся далягляды пазнання свету не ў ружовых танах, а ва ўсёй паўнаце, з усімі яго складанасцямі і супярэчнасцямі, бо задача любога пісьменніка сёння, тым больш паэта, заключаецца ў тым, «каб разбірацца ў гэтым складаным «перапляценні», каб вывучаць і даследаваць новыя жыццёвыя з'явы, тэндэнцыі і праблемы, каб смела ставіць пытанні і адказваць на іх». Гэта ўдаецца А. Вярцінскаму, які ні на хвіліну не забывае пра свой высокі маральны і грамадзянскі абавязак перад Радзімай — быць сынам свайго народа.

Творчая спадчына паэта можа здацца невялікай па аб'ёму, але вельмі плённай. Шырока вядомы яго кнігі «Песня пра хлеб», «Пры цішыні», «Чалавечы знак», «З'яўленне», «Ветрана» і інш.

А. Вярцінскі па свайму паэтычнаму складу — лірык. Аб гэтым сведчаць яго вершы і паэмы «Дажынкі», «Заазер'е», «Даруйце! Паэма віны». «Паэма мора». Зборнікі «Тры цішыні», «Чалавечы знак» ярка засведчылі вядомасць А. Вярцінскага як паэта-філосафа. Лірычны герой аўтара — наш сучаснік, які знаходзіцца ў няспынным руху наперад у пошуках ісціны. Паэт не цураецца ў сваёй паэзіі пафаснага закліку, трыбуннага ўзвышэння:

**Ветразь ёсць — плыві!**
**Есць крылы — ляці да неба!**
**Шчасце ёсць — жыві!**
**І — скардзіцца не трэба...**

Паэт не дэкламуе, а верыць у чалавека, у прыгажосць яго душы.

А. Вярцінскі — адзін з тых сучасных паэтаў, якія перажылі Вялікую Айчынную вайну, цяжкія пасляваенныя гады. Гэта не магло не адбіцца на творчасці паэта. У яго многа вершаў аб страшных гадах ваеннага ліхалецця («Рэквіем па кожным чацвёртым», «Дынамік», «Перад братняй магілай», «Бой», «Іх апошняя воля», «Цётка плакала па ўсім свеце», паэма «Песня пра хлеб»).

Паэзія А. Вярцінскага закранае праблемы: чалавечнасць і антычалавечнасць, гуманізм і антыгуманізм, дабро і зло. Аўтар ні на хвіліну не пакідае надзеі ў перамогу дабра, верыць у «добрае слова» «чалавечае» — усеагульнае наша імя».

У творчасці паэта ідзе «паглыбленне ва ўсеагульнасць, у псіхалагізм, які мы назвалі раманна-лірычным, у так званыя тэмы паэзіі, у філасофскі роздум, у спробы ўзняцца над прыватным увогуле». А. Вярцінскі імкнецца ў сваёй паэзіі да рацыяналізму, які арганічна яднаецца з глыбінёй інтэлекту, філасофскім роздумам, што дазваляе паўней пранікнуць у свет простых, адвечных радасцей і засмучэнняў звычайных людзей.

У А. Вярцінскага ёсць творы, у якіх ён пранікае ў гісторыю, злучыўшы яе з сучаснасцю — «Адлучэнне Талстога ад царквы», «Размова з Ду-Фу», «Каментарый да Карана», «Варыяцыі на тэму: «Гефест — друг Прамэтэя» і інш. Творы гэтыя — цікавая форма ўжыцця ў мінулае так, каб убачыць у ім тое, што мы маем сёння, чым кіруемся ў нашым жыцці.

Паэзія А. Вярцінскага з кожным годам радуе нас сваёй навізной. Аўтар эксперыментуе, парушае традыцыі архітэктонікі твораў і выпрацоўвае сваю новую мастацкую форму. У прыватнасці, паэма «Колькі лет, колькі зім» — твор, які увабраў у сябе і навізну мастацкасці, і арыгінальнасць.

У пошні час у творчасці А. Вярцінскага адбываюцца змены тэматыкі. Паэта хвалюе складанае міжнароднае становішча. Таму так страсна ў яго паэзіі гучыць матыў міру.

Сёння Анатоль Вярцінскі — у росквіце творчых сіл. Талент паэта раскрываецца з кожным годам больш поўна і шматгранна. Няхай жа неаслабная творчая энергія не пакідае паэта і ў будучым.

**Г. ХАРОШКА,**
**асістэнт кафедры беларускай літаратуры.**

## СПОРТ

### БРОНЗАВЫ ПРЫЗЁР

У Мінску фінішаваў чэмпіянат Беларусі па шахматах. Вострая барацьба у апошніх турах прынесла поспех нашаму земляку гомельскаму майстру Барысу Малісаву, які ўпершыню заваяваў тытул чэмпіёна рэспублікі.

У турніры паспяхова выступіў і студэнт вячэрняга аддзялення ГДУ будучы матэматык А. Міхалеўскі. На працягу ўсяго гэтага года Аляксандр дэманструе высокі клас гульні. У рэспубліканскім чэмпіянаце ён набраў 9 ачкоў з 15 магчымых і заваяваў бронзавы медаль.

**(Наш кар.)**



На здымку: чэмпіёны універсіяды па міні-футболу — каманда факультэта фізвыхавання.

Фота У. Чысціка.

### ТУРНІР ПА МІНІ-ФУТБОЛУ

Праведзены спаборніцтвы па міні-футболу, якія ўваходзяць у праграму XIII-й універсіяды. Усе матчы праходзілі ў напружанай і цікавай барацьбе. Узрослае тэхнічнае і тактычнае майстэрства прадэманстравалі каманды большасці факультэтаў. Дастаткова сказаць, што футбалісты эканомфака, якія летась былі другімі прызёрамі універсіяды, сёлета здолелі заняць толькі пятае месца. Пераможцай стала каманда факультэта фізвыхавання. Другое месца дасталася футбалістам фізічнага, трэцяе — геалагічнага факультэтаў.

**В. АСТАХАЎ,**
**суддзя спаборніцтваў.**

### РАЗЫГРАЛІ ПЕРШЫНСТВА

У спартыўнай зале ГДУ зборныя каманды універсітэта, Гомельскага політэхнічнага і Мазырскага педагагічнага інстытутаў разыгралі першынство абласнога таварыства «Буравеснік» па валейболу. Сярод мужчынскіх каманд мацнейшымі аказаліся гаспадары пляцоўкі. А вось сярод жаночых каманд чэмпіёнкамі сталі мазыранкі. Зноў прыходзіцца канстатаваць, што валейбалісткі універсітэта, якія ў свой час былі аднымі з мацнейшых у рэспубліцы, рэзка здалі свае пазіцыі.

*Пагаворым аб прымаўках*

# ШЫШКІ ВАЛЯЦЦА НА МАКАРА

Рускія прымаўкі і прыказкі, у якіх упамінаецца Макар, малююць вобраз беднага, забітага, няшчаснага мужычка. Прымаўка гаворыць: «Не рука Макару калачы есці». На Макара звальваюцца ўсялякія беды. Нават яловыя і сасновыя шышкі, якія падаюць з дрэва, трапляюць не ў абы каго, а менавіта ў беднага Макара: «На беднага Макара ўсе шышкі валяцца».

Макару і паша дастаецца недзе вельмі далёка. Таму, калі жадаюць сказаць, што хтосьці паехаў вельмі далёка, ужываюць выраз «Куды Макар цялят не ганяў».

Не выпадкова імя Макар увасабляе абагулены вобраз бедалагі. Макар у перакладзе з грэчаскай азначае «шчаслівчык». У гэтым выпадку праявілася іронія, якая так уласціва народнапаэтычнай мове.

Аналагічная гісторыя адбылася з імем Аніка, якое паходзіць да грэчаскага слова «Анікетас», што значыць «непераможны». У народзе расказвалі казку пра Аніку-воіна, які хваліўся смерць кірпатую на костачках разабраць. А ў выніку што атрымалася? Убачыў Аніка смерцюшку з касой ды шклянкай (г. з. пясочным гадзіннікам), спужаўся ваяка, узвыў не сваім голасам. І пайшла гуляць з той пары па Русі прымаўка: «Аніка-воін сядзіць пад кустом ды вые». Анікай-воінам называлі тых храбрацоў, якія на словах пагражалі і войска, і ваяводу ў адзін мах зваліць, а на справе маглі толькі, па прымаўцы, ваяваць на печы з тараканамі.

**В. ВАКУРАЎ,**
**кандыдат філалагічных навук.**

## ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

# І НІ ТУДЫ, І НІ СЮДЫ...

Ён жа проста няўмека. Нічога не можа. Бегаць не можа, скакаць — тым больш. На перакладзіне падцягваецца роўна адзін раз. На лыжы стане, дык потым трэба шагаючы экскаватар выклікаць, раскопкі рабіць. Мячом у яго выпадкова трапяць — ён ужо ўляцеў... у вароты. А мяч на месцы застаўся. Ды калі б толькі гэта. Аб працоўных навыках ужо і гаварыць не прыходзіцца: ні табе спрыту, ні табе жадання, ні імунітэту. Ледзь на свежым паветры тэмпература панізілася — у яго ўжо павысілася. У падшэфным саўгасе буракі прапалоўвалі, а ён носам хлюпае. І ўсё разважае — гэта ён можа. Лезе са сваімі пытаннямі. А чаму у нас не так, чаму ў нас не гэтак? А сам — пасіўны, ні агеньчыка, ні запалу, нічым яго не возьмеш і нікуды не выцягнеш: ні ў паход, ні ў культпаход, ні на месячнік па барацьбе з правапарушальнікамі грамадскага парадку — тыпічны лішні чалавек.

Ну, які ж ён пасля ўсяго гэтага навуковы супрацоўнік?

**Д. СМЕХАЎ.**

**Рэктарат, партком, мясцком, калектыў універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне рэктару ГДУ, акадэміку АН БССР БОКУЦЮ Барысу Васільевічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БРАТА.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, ректората, месткома, комитета ЛКСМБ и профкома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.

АЗ 20824 Заказ 6433